ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (764) ● Пятніца, 27 лютага ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

## Учора ў Мінску пачаў сваю работу XXIV з'езд ЛКСМ Беларусі



## МОЛАДЗЬ У НАВУКОВЫМ ПОШУКУ

Учора у сценах універсітэта адкрылася студэнцкая навуковая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Маладыя даследчыкі — студэнты гістарычнага, біялагічнага, фізічнага, геаграфічнага, юрыдычнага, матэматычнага і факультэта журналістыкі, — стаушы за прафесарскія кафедры, дакладваюць аб выніках свайго навуковага пошуку у архівах, музеях, на прамысловых прадпрыемствах, дзеляцца вывадамі, заключэннямі, знаходкамі, здабытымі карпатлівай працай.

Кола студэнцкіх навуковых інтарэсау надзвычай шырокае. У секцыях гісторыі СССР, гісторыі КПСС, логікі і гісторыі філасофіі, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі і міжнароднага маладзёжнага руху, гістарыяграфіі і крыніцазнауства, палітэканоміі, ваеннай гісторыі і іншых будзе прачытана больш 300 дакладау.

Мы папрасілі некаторых навуковых кіраунікоу з кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтау расказаць аб найбольш цікавых работах.

Дацэнт **З. Р. Грыгор'ева** адзначыла даклад студэнткі V курса гістфака Л. Саглаевай «Дзейнасць камсамольскай арганізацыі Беларусі па выхаванню моладзі на рэвалюцыйных і баявых традыцыях (1966—1969 гг.)». Працуючы над тэмай, Л. Саглаева выкарыстала матэрыялы архіва ЦК камсамола, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Брэсцкай крэпасці і Брэсцкага абкома камсамола. Вызначаецца глыбокай распрацоукай тэмы, па словах З. Р. Грыгор'евай, і даклад студэнткі V курса вячэрняга аддзялення гістфака В. Верашчагінай «Распрацоука У. І. Леніным першай аграрнай праграмы і прыняцце яе на II з'ездзе РСДРП». Аутар дае тэарэтычнае абгрунтаванне праграмы, паказвае дыскусію, разгорнутую на з'ездзе. У дакладзе выкарыстаны матэрыялы пратаколау з'езда.

Багатыя сучасныя даныя сабрау студэнт III курса В. Ванц, які падрыхтавау даклад «Некаторыя пытанні ленінскай тэорыі сацыялістычнай рэвалюцыі і сучаснасць».

— Змястоуную тэарэтычную і дакументальную літаратуру выкарыстау у рабоце над дакладам «Ленінскае вучэнне аб культуры» А. Коршунау (III курс гістфака), — расказала дацэнт **І. О. Царук**.—Ён выкрывае сучасных фальсіфікатарау сацыялістычнай культуры і паказвае рэакцыйную сутнасць антыкамунізму. Вельмі цікавы, напісаны на фактычным матэрыяле, даклад трэцякурсніцы Н. Ермаковіч «Атэістычнае выхаванне школьнікау».

— Зацікавіушыся камсамольска-маладзёжным друкам Беларусі у гады Вялікай Айчыннай вайны, студэнтка журфака С. Алексіевіч выявіла некалькі раней не вядомых нумароу газет, прааналізавала іх і падрыхтавала цікавы даклад «Зброяй ленінскіх ідэй», — адзначыу прафесар **А. Я. Журау**. — Публіцыстычнай мовай напісана работа Г. Адамсон (III курс журфака) «Ленін аб адзінстве і пераемнасці пакаленняу пры сацыялізме». Раскрываючы ленінскія думкі, аутар гаворыць аб прычынах канфлікту пакаленняу у буржуазным грамадстве, характарызуе узаемаадносіны савецкіх людзей, прыводзіць прыклады са сваёй журналісцкай практыкі.

А вось як ацэньвае прафесар **М. Я. Шкляр** работу студэнта IV курса В. Кушнера «Удзел інтэрнацыяналістау у барацьбе за перамогу і умацаванне Савецкай улады у Беларусі».

— Работу В. Кушнера трэба лічыць даволі арыгінальным даследаваннем, яна заслугоувае высокай адзнакі.

Мы назвалі толькі некалькі імён з вялікай арміі захопленых навукай студэнтау. А лепш пазнаёміцца з імі і іх цікавымі даследаваннямі можна, пабываушы на канферэнцыі, якая працягвае работу сёння у галоуным корпусе універсітэта і закончыцца заутра.

**А. АЛЕНІЧ.**



*Студэнты 4-га курса фізічнага факультэта аддзялення радыёфізікі Уладзімір Вапнарскі і Міхаіл Аусянікау праводзяць эксперымент па даследаванню магчымасцей і эфектыунасці пабудовы схем на палявых транзістарах.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

## З ТВОРЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВАЙ

**На адным з партыйных сходау гістарычнага факультэта разгледжана пытанне аб стане і задачах навукова-даследчай работы. Як адзначалася, планы мінулага года поунасцю выкананы. Гэтаму садзейнічала сацыялістычнае спаборніцтва, разгорнутае у сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння У. І. Леніна. На кафедры гісторыі СССР дацэнтам П. З. Савачкіным напісана праца «Навуковая работа на гістарычным факультэце за 50 год», дацэнт М. П. Баранава падрыхтавала раздзел манаграфіі па крыніцазнаўству, абараніў кандыдацкую дысертацыю Ф. І. Адашчык.**

**Значную навукова-даследчую работу праводзіць і кафедра гісторыі БССР. Паспяхова працавалі над сваімі тэмамі дацэнты Д. Б. Мельцар, Э. М. Загарульскі, А. П. Ігнаценка. У 30 друкаваных аркушаў выпушчана манаграфія прафесара Л. С. Абецэдарскага.**

**На кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоу прафесарам Ф. М. Нячаем падрыхтавана манаграфія «Узнікненне Рымскай дзяржавы». Н. А. Гусакова апублікавала артыкул «Беларуска-чэшскія сувязі у эпоху феадалізму». Выпусцілі манаграфіі члены кафедры новай і навейшай гісторыі прафесары Л. М. Шнеерсон, Н. П. Палетыка, Г. М. Трухноу.**

**Усяго за 1969 год кафедрамі гістарычнага факультэта апублікавана навуковых работ агульным аб'ёмам у 179,2 друкаваных аркушаў. Працы прафесараў Ф. М Нячая і Г. М. Лічушыца выйшлі на саюзную арэну і уключаны ў праграмы для студэнтаў усёй краіны.**

**Вялікай творчай ініцыятывай ахоплена і студэнцтва. Цяпер на факультэце дзейнічаюць шэсць гурткоў: археалогіі, гісторыі СССР, гісторыі новага і навейшага часу, гісторыі КПСС, гісторыі філасофіі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоу. Тут спрабуюць свае сілы каля 200 студэнтаў.**

**У гуртках СНТ маладыя даследчыкі вывучаюць методыку навуковай працы, прывыкаюць эканомна выкарыстоўваць час, выпрацоуваюць у сябе зацікауленасць да вучобы.**

**Пяць работ (Іванова, Каваленка, Шчарбачэні, Губарэвіча, Пашкоускага), прадстауленых гісторыкамі на усесаюзны агляд, адзначаны падзякамі і граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Студэнты факультэта ужо пабывалі на навуковых канферэнцыях у Ужгарадзе, Кішынёве, Калінінградзе, Петразаводску, Ерэване і іншых гарадах краіны.**

**Ф. МЕЛЬНІК.**

## У АТМАСФЕРЫ ІДЭЙНАЙ НАСТРОЕНАСЦІ

Рыхтуючыся да заключнага этапу Ленінскага заліку і з мэтай больш глыбокага вывучэння Тэзісау ЦК КПСС «Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», камсамольская арганізацыя 4-га курса геолага-геаграфічнага факультэта правяла навукова-тэарэтычную канферэнцыю на тэму «Ленінізм—пераможны сцяг сучаснай эпохі».

У зале, урачыста упрыгожанай плакатамі і лозунгамі, у атмасферы глыбокай ідэйнай настроенасці адкрыла канферэнцыю камсорг курса Л. Слабодская.

«У. І. Ленін — палітычны дзеяч новага тыпу», «У. І. Ленін — тэарэтык і правадыр сацыялістычнай рэвалюцыі», «Інтэрнацыянальны характар ленінізма», «Ленінізм — сцяг барацьбы за адзінства рэвалюцыйных сіл сучаснасці», «Перамога ленінскага плана пабудовы сацыялізма», «Роля моладзі у барацьбе за пабудову камунізма» — з такімі дакладамі пазнаёмілі слухачоу студэнты В. Салыніна, Е. Кулікоуская, Л. Ушакова, І. Богдзель, А. Асмалоускі, В. Галубеу.

Сярод гасцей прысутнічаў член КПСС з лютага 1917 года, ветэран рэвалюцыі, які тройчы асаоіста сустракауся з У. І. Леніным, Уладзімір Адамавіч Ваверау. Ён расказау пра Уладзіміра Ільіча з вялікім пафасам і пад'ёмам. Яго расказ быу сустрэты бурнымі апладысментамі.

На канферэнцыі прысутнічалі камсамольскі актыу факультэта, выкладчыкі і кураратары груп, сакратар партыйнага бюро факультэта М. К. Чартко, загадчык кафедры навуковага камунізма М. Р. Круцько.

Вынікі тэарэтычнай канферэнцыі падвёу супрацоунік кафедры навуковага камунізма І. І. Уласенка. У заключэнне удзельнікі слухалі прамову У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола «Задачы Саюзаў моладзі».

Канферэнцыя паказала высокую палітычную свядомасць камсамольцаў, ідэйную перакананасць, вялікую зацікаўленасць да работ і жыцця У. І. Леніна.

**В. ГРАБНЁЎ,**
**студэнт 4-га курса.**

## ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Мінскі гарком камсамола арганізавалі кінафестываль для замежных і савецкіх студэнтау, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У праграму уключаны мастацкія і дакументальныя фільмы аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна, а таксама аб гістарычным шляху нашай краіны, аб камсамоле Беларусі, аб гераічнай барацьбе савецкага народа за сваю свабоду і незалежнасць.

У канферэнц-зале Беларускага таварыства дружбы днямі адбыуся першы прагляд фільмау. Былі паказаны савецкім студэнтам і замежным гасцям дакументальная кінакарціна «Жывей за усіх жывых» і мастацкі фільм «У дні Кастрычніка».

Да канца гэтага навучальнага года студэнты змогуць паглядзець фільмы «Жывы Ленін», «Журавушка», «Паблізу Расіі», «Пралог», «Чалавек з ружжом», «Ленін у 1918 годзе», «Камуніст», «Бацька салдата» і іншыя.

**У. СЯРГЕЕУ.**

# СУСТРЭЧА З ГЕРАІЧНЫМ МІНУЛЫМ

*Да 25-годдзя Перамогі*

Ёсць месца, дзе да гэтага часу не сціхла далёкае рэха вайны. Уваходзіш—і адчуваеш яе суровы подых. Тут цішыня, гулкая і насцярожаная. Астылі гарматы пасля доўгіх, надрыўных баёў, мірна прыхінуліся да сцяны аўтаматы і кулямёты. Яны сваё адваявалі, і зараз знаходзяцца на заслужаным, ганаровым адпачынку...

Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У новым, светлым памяшканні размешчаны цікавыя экспанаты і дакументы.

Нельга не хвалявацца, гледзячы на асабістыя рэчы, узнагароды, дакументы людзей, імёны якіх ведаеш з дзяцінства. Вось гімнасцёрка і камсамольскі білет Наганава, абаронцы Брэсцкай крэпасці. Шынель генерала Даватара. Аўтамат Рымы Шаршнёвай, з якім яна ішла у свой апошні бой... Маўклівыя рэліквіі, сведкі далёкага гераічнага часу.





Метал разбураўся, рваўся, плавіўся. Але не плавіўся загартаваны на агні рэвалюцыі характар савецкага чалавека. Загінулі не зломленыя катамі, зневажаючыя смерць і перамагаючыя яе, тыя, чые абгарэлыя косці маўклівым дакорам вайне ляжаць у гранітным склепе пасярод залы. Тут паўзмрок... Фабрыка смерці, Трасцянец — панарама вёскі, акружанай калючым дротам, а над ёй — палыхаючае зарыва у паўнеба. Суровы і урачысты, кранаючы сэрца, голас Левітана: «Праз гады і праз стагоддзі — памятайце»....

Кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у гады вайны. Удзячныя нашчадкі ніколі і нічога не забылі.

Героі мінскага падполля. Маладыя хлопцы і дзяўчаты, усе камсамольцы. Выхаваныя Савецкай уладай, яны самае дарагое — жыццё аддалі Радзіме. Колькі храбрасці, патрыятызму праявілі яны, колькі пакут вынеслі ад катаў!

Нязменна прыцягваюць увагу знаёмыя томікі ў чырвоным пераплёце. Творы Леніна. Трэцяе выданне. Пацёртыя вокладкі, пажаўцелыя старонкі... Нехта усю вайну, як самую дарагую каштоўнасць, хаваў іх у доме № 27 па вуліцы Энгельса. Імя патрыёта устанавіць не удалося, але несумненна, што гэтыя кнігі знаходзіліся на баявым узбраенні беларускіх партызан і падпольшчыкаў.

Экскурсавод тав. Федарчук быццам праводзіць усхваляваных наведвальнікаў па сцежках баявой славы байцоў.

Наступная зала — партызанская Беларусь. І словы У. І. Леніна як эпіграф: «Партызанская барацьба — не помста, а баявыя дзеянні».

Е. І. Брыль, былы намеснік камісара партызанскага атрада «Праўда» расказвае пра адну з буйнейшых аперацый — пра падрыў галоўнага моста Прыбалтыйскай чыгункі у час рашаючых баёў пад Сталінградам.

І зноў франтавыя старонкі.

Зала апошняга года вайны у сувязі з набліжэннем 25-годдзя Перамогі папаўняецца новымі экспанатамі. Адкрыецца яна к 9 мая.

Пасля агляду экспанатаў наведвальнікі ідуць у кіназалу. Кожны вечар тут праводзяцца тэматычныя вечары, сустрэчы з былымі воінамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. У дзень 25-годдзя з дня гібелі генерала Карбышава на сустрэчу з моладдзю прыйшоў генерал-лейтэнант у адстаўцы Герой Савецкага Саюза І. С. Жыгараў. Яго баявы шлях па дарогах вайны пралёг ад палёў Беларусі да сцен рэйхстага. На гэты раз ён расказаў пра адну з самых важных аперацый Вялікай Айчыннай вайны — аперацыю «Баграцён».

Аб франтавой дружбе, якая вяла салдат праз смерць, аб самых апошніх днях вайны вёў гутарку палкоўнік запасу К. М. Аносаў.

А. І. Морава, член КПСС з красавіка 1917 года, была дэлегатам першага усерасійскага з'езда работніц і сялянак у 1918 годзе. На гэтым з'ездзе выступіў з кароткай прамовай У. І. Ленін. На усё жыццё запомніўся А. І. Моравай той дзень. Аб дарэвалюцыйным жыцці, аб станаўленні маладой Савецкай рэспублікі расказвала яна прысутным...

Закончыўся вечар сустрэчы з ветэранамі. Усхваляваныя, разыходзяцца юнакі і дзяўчаты....

Не зарастаюць сцежкі да баявых рэліквій славы байцоў.

**В. ФЕРАНЦ,**
**студэнт журфака.**

**На здымках: (уверсе) у музеі Вялікай Айчыннай вайны. Уважліва слухаюць студэнты БДУ расказ генерал-лейтэнанта у адстаўцы Героя Савецкага Саюза І. С. Жыгарава аб подзвігах савецкіх людзей у гады вайны; (унізе) сярод воінаў ЧБВА удзельнік гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці пісьменнік А. І. Махнач.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# ЗАЎСЁДЫ ДАРАГОЕ, НЕЗАБЫЎНАЕ

З імем Уладзіміра Ільіча праходзіць усё маё жыццё, і не толькі маё асабістае, але і жыццё ўсяго нашага народа, усяго прагрэсіўнага чалавецтва. У свядомасці людзей Уладзімір Ільіч з'яўляецца ўвасабленнем усяго самага лепшага, перадавога, што кліча на новыя подзвігі і здзяйсненні.

Упершыню мне пашчаслівілася слухаць Уладзіміра Ільіча Леніна 1 Мая 1918 года ў Маскве на Краснай плошчы. Няўмольны час— з той пары прайшло 52 гады — не сцёр у памяці тое незвычайна моцнае ўражанне, вялікае захапленне, якія былі выкліканы ў шматтысячнай масы людзей паяўленнем У. І. Леніна на першамайскім свяце.

Паўсядзённы воблік Краснай плошчы змяніўся: яна палыхала чырвонымі сцягамі, лозунгамі, плакатамі, з краю ў край пералівалася музыкай, песнямі.

Памятаецца, прыкладна ў дзесяць гадзін раніцы раскрыліся вароты Спаскай вежы Крамля, зацокалі капыты коней, трубачы абвясцілі пачатак першамайскага мітынгу. Нябачная, але дастаткова адчувальная хваля цішыні каціласся ўздоўж крамлёўскіх сцен, аддаючы дань павагі героям кастрычніцкіх баёў, тут пахаваных.

Кавалерысты выстраіліся па камандзе і салютавалі Леніну, які выходзіў са сваімі саратнікамі на плошчу.

Громам авацый сустрэла Красная плошча свайго любімага правадыра, стваральніка першай у свеце пралетарскай дзяржавы. Ленін хутка падняўся на трыбуну. Усё сціхла. Тысячы позіркаў былі накіраваны на Уладзіміра Ільіча, сэрцы ўсхвалявана біліся, усе зачаравана слухалі.

— Таварышы! — пранеслася над галовамі тысяч людзей. — Грамадзяне Савецкай Расіі!

Кожнае слова Леніна пранікала ў сэрца. Вялікі правадыр павіншаваў усіх са святам 1 Мая, святам пралетарскай салідарнасці. Ён заклікаў рабочых, салдат і сялян мацаваць маладую Савецкую рэспубліку, пераможны сцяг якой лунаў над Крамлём.

Ленін пераходзіў ад адной трыбуны да другой, яго рух па гэтаму кругу суправаджаўся бурнымі прывітаннямі. У кароткіх выступленнях Уладзімір Ільіч расказваў аб нябачаных скарбніцах, якія захоўвала ў сябе тады яшчэ бедная, паўгалодная краіна.

Гучнае «ўра», спяванне «Інтэрнацыянала» раздаваліся ў той частцы плошчы, дзе Ленін, закончыўшы выступленне, спускаўся з трыбуны. Але Ільічу не давалі ступіць на зямлю, яго падхаплівалі на рукі і неслі да наступнай трыбуны, дзе ўжо рыхтавалася новая сустрэча.

Многія з прысутных забылі, што яны паўгалодныя, дрэнна адзетыя. Яны радаваліся: на іх долю выпала вялікае шчасце, шчасце непаўторнае, незабыўнае—яны бачылі самага блізкага, дарагога чалавека.

**М. КЛІМКО,**
**дацэнт, член КПСС з 1918 г.,**
**персанальны пенсіянер.**



**На здымку:** ідуць заняткі па судова-аператыўнай фатаграфіі ў другой групе IV курса юрыдычнага факультэта. Вядзе іх Ірына Антонаўна **Матусевіч.**

# СПАБОРНІЧАЮЦЬ ЛЕПШЫЯ





У нядзелю у Доме культуры трактарнага завода адбыуся адборачны канцэрт-агляд калектывау, якія маюць ганаровыя званні народных. Нашы калектывы — народная харавая капэла, народны аркестр народных інструментау, народны ансамбль танца «Крыжачок»— прынялі у гэтым аглядзе самы актыуны удзел. Акрамя іх, на сцэне змянялі адзін аднаго лепшыя народныя самадзейныя калектывы г. Мінска. Сярод іх народныя аркестры Палаца прафсаюзау, Дома культуры мясцовай прамысловасці, народныя хоры і народныя харавыя капэлы «Працоуных рэзервау», Дамоу культуры трактарнага і аутамабільнага заводау, народныя ансамблі танца «Лявоніха», політэхнічнага інстытута, Дома афіцэрау і многія іншыя.

Так здарылася, што нашы калектывы і пачыналі і заканчвалі агляд. Першым выступіу народны аркестр (мастацкі кіраунік і дырыжор М. А. Лісіцын), які выканау «Фантазію на дзве рэвалюцыйныя песні». А закрывау спаборніцтва талентау ансамбль танца «Крыжачок» «Рускім танцам».

Аднагалосным было меркаванне журы (у яго саставе Цітовіч, Маслау, Раудо, Білібін, Дрэйчын і многія іншыя) аб нашым аркестры. Захопленасцю, выканаучым майстэрствам ён быу на галаву вышэй за іншыя калектывы

Роуна выступіла народная харавая капэла. Добрае уражанне зрабілі яе рэпертуар і выканаучы узровень.

Упершыню сярод народных калектывау быу наш «Крыжачок». І трэба адзначыць, што гэты калектыу не толькі не страціу былога аутарытэту, але адточанасцю і зладжанасцю пераузыходзіу нават «Лявоніху».

Гэты агляд быу праверкай гатоунасці нашых калектывау да фестывалю, прысвечанаму 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Галоунае — наперадзе! Таму важна не упусціць час для заключнай дапрацоукі праграмы.

**В. ЛІТВІНКА,**
**старшыня праулення студэнцкага клуба.**



●

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) выступае народны аркестр народных інструментау. Дырыжыруе Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын; (справа) народная харавая капэла; (злева) народны ансамбль танца «Крыжачок» выконвае польскі танец.

Фота Д. Чаховіча.

●

## *Гутарка з ваеннымі журналістамі*

**На факультэце журналістыкі адбылася традыцыйная сустрэча студэнтау і выкладчыкау з ваеннымі журналістамі, прысвечаная Дню Савецкай Армн і Ваенна-Марскога Флоту. На гэты раз гасцямі факультэта былі літсупрацоунік газеты «Во славу Родины» падпалкоунік М. В. Гур'еу, загадчык ваенна-патрыятычнага аддзела рэспубліканскай газеты «Звязда» падпалкоунік І. В. Цітоу, загадчык аддзела прапаганды газеты «Во славу Родины» падпалкоунік В. Ф. Ізгаршау і старэйшы кінарэпарцёр рэспублікі М. С. Берау.**

**Присутныя з вялікай цікавасцю праслухалі успаміны аб гераічнай працы ваенных журналістау і кінаапаратарау у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб асаблівасцях іх работы у нашы дні.**

## МЕДАЛЬ ІМЯ С. І. ВАВІЛАВА

Савет Міністрау СССР з мэтай заахвочвання вучоных, выкладчыкау, інжынерна-тэхнічных работнікау і іншых прапагандыстау, якія актыуна вядуць работу па распаусюджанню палітычных і навуковых ведаў, пастанавіу увесці настольны медаль імя выдатнага савецкага вучонага, першага старшыні Усесаюзнага таварыства «Веды» акадэміка С. І. Вавілава.

Медаль імя С. І. Вавілава будзе прысуджацца штогод 20—25 лепшым лектарам за заслугі у прапагандзе палітычных і навуковых ведаў, у камуністычным выхаванні працоуных, у тым ліку прагрэсіуным вучоным з замежных краін.

Медаль імя С. І. Вавілава прысуджаецца рашэннем праўлення Усесаюзнага таварыства «Веды».

### Для тых, хто працуе і вучыцца

# З ПАРАДКАМ СЯБРУЕ РОЗУМ

Наўрад ці знойдзецца ў нашай краіне сям'я, у якой не было б навучэнцаў: вучацца рабочыя і калгаснікі, маладыя і старыя, дзеці і дарослыя. Многія сумяшчаюць заняткі з работай на прадпрыемстве ці ва ўстанове і скардзяцца часам на стому, гавораць, што не паспяваюць выконваць заданні, мала спяць, недастаткова адпачываюць. Цяжка, вядома, сумясціць работу і вучобу, але нярэдка ўсё гэта ўскладняецца няўменнем размеркаваць свой час, няведаннем асноў гігіены, правіл арганізацыі разумовай працы.

Што ж парэкамендаваць людзям, якія вучацца вечарамі і завочна?

Беручыся за асваенне новага матэрыялу, неабходна сканцэнтраваць на ім усю сваю ўвагу, без гэтага цяжка запомніць. Намнога карысней прачытаць тэкст 2—3 разы з поўнай увагай, чым чытаць 10 разоў, але разгублена. Так лягчэй разабрацца ў змесце матэрыялу, а значыць, глыбей яго зразумець. Мэтазгодна тэкст разбіць на сэнсавыя раздзелы і ў кожным з іх знайсці асноўныя, апорныя палажэнні. Неабходна таксама ўстанавіць сувязь паміж раздзеламі. Калі ўявіць гэтую работу ў пісьмовым варыянце (што вельмі дапамагае запамінапню), то яна будзе мець выгляд плана.

Пасля такога паглыбленага азнаямлення з тэкстам можна пераходзіць да наступнага этапу — «узнаўлення» матэрыялу. Гэта адносіцца і да таго, што неабходна ведаць напамяць (вершы), і да матэрыялаў, якія не патрабуюць даслоўнага завучвання. Паўтараючы матэрыял у думках, можна часта звяртацца да тэкста, каб праверыць правільнасць узнаўлення.

Калі раздзел у асноўным вывучан, трэба яшчэ замацаваць яго ў памяці, а для гэтага паўтараць, але не раз за разам, а праз некаторыя прамежкі часу. Аўралы не даюць жаданага эфекту.

Вельмі карысна чаргаваць дысцыпліны найменш падобныя паміж сабой — «пераключэнне» дазваляе даўжэй захаваць высокую працаздольнасць мозга. Напрыклад, заданні па фізіцы, матэматыцы, літаратуры мэтазгодна выконваць у такой паслядоўнасці: фізіка — літаратура — матэматыка ці ў адваротным парадку, але каб літаратура заставалася пасярэдзіне.

Цяпер 2—3 банальныя ісціны. Для плённага вывучэння неабходна рацыянальна асвятліць рабочае месца, «добраўпарадкаваць» яго, захаваць правільную паставу. Калі доўга сядзіш за сталом, то ў пэўнай ступені ўскладняецца кровазварот. Каб пазбегнуць гэтага, праз кожныя 30—40 мінут трэба пацягнуцца, прагнуць пазваночнік, адвесці назад галаву, выцягнуць пад сталом ногі, зрабіць некалькі глыбокіх удыхаў і выдыхаў. Мінула гадзіна-паўтары — невялікі перапынак. Добра выкарыстаць гэтыя 5—10 мінут, каб зрабіць некалькі гімнастычных практыкаванняў. З іх дапамогай хутчэй аднаўляецца глыбокае дыханне, нармалізуецца кровазварот, адступае стома, павышаецца настрой.

Важна, па магчымасці, пазбавіцца таго, што перашкаджае вам сканцэнтравацца: пабочных гукаў, размовы, шуму транспарту. К. Маркс, як вядома, лічыў за лепшае працаваць тады, калі дома найбольш ціха. Л. Талстой выбраў для свайго кабінета ізаляваны пакой—пад «скляпеннямі». Здавалася, што з гэтага пункту гледжання займацца лепш за ўсё па начах. Але такое рашэнне было б няправільным—большасць людзей стамляецца за дзень, і начная праца становіцца ўжо малапрадукцыйнай. Яшчэ Цыцэрон зазначаў, што «плён начной работы заўсёды аддае лямпай». Гігіеністы супраць начнога «няспання».

Асабліва шкодна адбіваецца на разумовай дзейнасці забруджванне паветра тытунёвым дымам. Не выпадкова У. І. Ленін сачыў за тым, каб памяшканні, дзе ішлі пад яго кіраўніцтвам пасяджэнні, былі добра правetраны і ніхто з удзельнікаў не курыў. М. А. Сямашка ў сваіх успамінах пісаў, што вентыляцыя і форткі заўсёды дзейнічалі; Уладзімір Ільіч быў ворагам курэння («тытунёвага зелля», як ён называў); курыць у час пасяджэнняў ён катэгарычна забараняў.

Няма патрэбы, напэўна, спецыяльна даказваць, што пры любым відзе дзейнасці, і асабліва пры разумовай працы, неабходна захоўваць цвёрды распарадак дня, уставаць раніцай у адны і тыя ж гадзіны, рабіць зарадку, прымаць, калі няма медыцынскіх проціпаказанняў, водныя працэдуры. Дакладны распарадак працы і адпачынку павышае працаздольнасць, захоўвае здароўе.

Поспех у вучэнні немагчымы, вядома, калі адносіцца да яго без цікавасці, і, наадварот, гарачае жаданне далучыцца да новых ведаў служыць вельмі магутным стымулятарам працаздольнасці. Механізм гэтай з'явы вывучаны — дадатныя эмоцыі, дзейнічаючы праз вышэйшыя аддзелы цэнтральнай нервовай сістэмы, узбуджаюць работу эндакрынных залоз, сістэмы кровазвароту, органаў пачуцця, а ўсё гэта павышае ў канчатковым выніку прадукцыйнасць разумовай працы.

**І. БЯЛЯЕЎ,**
прафесар, член-карэспандэнт АМН СССР.



Ва універсітэцкім студэнцкім тэатры ідуць заключныя рэпетыцыі п'есы М. Алігер «Казка аб шчасці». Прэм'ера спектакля адбудзецца напярэдадні Ленінскага юбілею ў красавіку.

**На здымку:** рэпетыцыя адной з масавых сцэн спектакля.

Фота **М. Кузняцова.**

# НАВУЧЫ НАС, ЖЫЦЦЁ

Кожны новы зборнік, выдадзены у серыі «Першая кніга паэта», выклікае цікавасць аматараў паэзіі, прыцягвае іх увагу да маладога аутара. Леаніда Дайнеку навічком у паэзіі не назавеш. Яго вершы ужо некалькі гадоу друкуюцца на старонках раённых, абласных і рэспубліканскіх газет і часопісау. Зборнік «Галасы» сканцэнтравау у сабе тое лепшае, што было здабыта паэтам. Тэмы самыя разнастайныя: услауленне роднай беларускай зямлі, каханне, успаміны пра мінулае і роздум пра будучае.

Большасць вершау падкупляе тонкім лірызмам, жаданнем як мага глыбей зазірнуць у таямніцы чалавечай душы і закрануць яе дзіуныя струны. Унутраны свет сучасніка, яго адносіны да з'яу рэчаіснасці—вось галоуны напрамак вершау, сабраных у зборніку. Лірычны герой Л. Дайнекі—юнак нашых дзён, які сам выбірае сабе у жыцці часам нялёгкія, але заусёды цікавыя дарогі, адметнымі рысамі якога з'яуляюцца закаханасць у жыццё, вечны пошук свайго месца на зямлі. «Ах, чалавек, ты вельмі рана прыдумау якары», — зазначае паэт.

Ен уважліва сочыць за сваім героем:

**Што ты знойдзеш,**
**чалавек,**
**На сваім шляху!**
І тут жа прызнаецца:
**Я хачу, каб ты знайшоу,**
**Сэрцам напаткау**
**Сто адданейшых сяброу,**
**Сто вялікіх спрау.**

Лірычны герой Леаніда Дайнекі аддана любіць сваю Радзіму, край, дзе нарадзіуся і вырас, хоча, каб край гэты стау яшчэ прыгажэйшым. Герой разумее, што куды б яго ні кінуу лес, дзе б яму ні давялося жыць, толькі Радзіма дасць сапраудныя шчасце і радасць. Ён прагна слухае «словы сваёй роднай зямлі» і клянецца ёй у вернасці:

**Зямля мая! Мой дом, мой**
**хлеб адзіны,**
**Я вечна твой, я б'ю табе**
**чалом.**

З сыноуняй любоую да Радзімы пераплятаецца і светлае каханне да дзяучыны. Раз у жыцці прыходзіць яно да нас і ідзе побач праз усё жыццё. Толькі, зазначае аутар, «не трэба клясціся у любві ад вечара да рання». Сапраудная каханне абыходзіцца без прысягання, без абяцання, яно светлае, як майскі дзень, шчырае, як сумленне дзіцяці, «і не даруе нам з табой яно фальшывай ноты». Калі ж закрадзецца хоць адна — «услед за ціхімі шпакамі каханне у вырай адлятае».

Звяртаюць на сябе узагу вершы аб мінулым —«Прадзеды», «Дарога з цемры», вершы аб вайне. Чорнай навальнічнай хмарай пранеслася яна — і паэт з горыччу усклікае: «О, як многа на Беларусі кургаоу!» Але цвіце і красуе прыгожай кветкай наша жыццё — і паэт славіць яго і у той жа час просіць:

**Не вучы нас, жыццё,**
**Ваяваць з ветракамі.**
**Ваяваць з ветракамі**
**Мы умеем і самі.**
**Навучы нас, жыццё,**
**Без ніякай падказкі**
**Бачыць ворага твар**
**Праз усякія маскі.**

У зборніку не так ужо і многа вершау, але трэба адзначыць, што напісаны яны добра, на большасці з іх ляжыць адбітак паэтычнай прастаты, пэунай завершанасці у выбары таго ці іншага слова. Мяркую, што першая кніжка вершау Леаніда Дайнекі прыйдзецца да спадобы чытачам.

**В. ШЫХАНЦОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

**Л. Дайнека. «Галасы». Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1969.**

# АДКУЛЬ ПАЙШЛО?

**Все пройдет, как с белых яблонь дым.**

Цитата из стихотворения С. А. Есенина «Не жалею, не зову, не плачу» (1922).

**Все пустяки в сравнении с вечностью.**

Парадокс, повторяемый художником Череваниным в повести Н. Г. Помяловского «Молотов» (1861). Выражение это восходит к латинскому «sub specie aeternitatis» («с точки зрения вечности» или «в сравнении с вечностью») и в разговорной речи употребляется как формула утешения в значении: не стоит огорчаться, то ли еще бывает.

**Все смешалось в доме Облонских.**

Цитата из романа Л. Н. Толстого «Анна Каренина». Употребляется как образное определение путаницы, неразберихи.

**Все это было бы смешно,**
**Когда бы не было так грустно.**

Цитата из стихотворения М. Ю. Лермонтова «А. О. Смирновой» (1840):

Без вас хочу сказать вам много,
При вас я слушать вас хочу...
Что ж делать?... Речью неискусной
Занять ваш ум мне не дано...
Все это было бы смешно,
Когда бы не было так грустно.

**Галантерейное, черт возьми, обхождение.**

Цитата из комедии Н. В. Гоголя «Ревизор» (1836), слова Осипа, слуги Хлестакова: «Пойдешь на Щукин (рынок)—купцы тебе кричат: «Почтенный»; на перевозе в лодке с чиновником сядешь; компании захотел — ступай в лавочку: там тебе кавалер (солдат) расскажет про лагери и объявит, что всякая звезда значит на небе... горничная иной раз заглянет такая.... Фу, фу, фу!.. Галантерейное, черт возьми, обхождение!» Отсюда выражение «галантерейное обхождение» употребляется как ироническое определение чрезмерно любезного, галантного обращения.

**Гомерический хохот (смех).**

Выражение употребляется в значении: неудержимый, громкий хохот. Возникло из описания смеха богов в поэмах Гомера «Илиада» и «Одиссея». Эпитет «гомерический» употребляется еще в значении: обильный, огромный.

**Гора родила мышь.**

Выражение восходит к басне Эзопа, известной только в переделке римского баснописца Федра (I в.н.э.), и употребляется, когда говорят о больших надеждах, но малых результатах, о том, кто обещает многое, но дает очень малое.

**Гордиев узел.**

По легенде, рассказанной древними историками, фригийцы, которым оракул повелел избрать царем того, кто первый встретится им с телегой по дороге к храму Зевса, повстречались с простым земледельцем Гордием и провозгласили его царем. Телегу, изменившую его судьбу, Гордий поставил в храме Зевса и к дышлу ее прикрепил ярмо, завязав чрезвычайно запутанный узел. По предсказанию оракула, сумевший распутать этот узел должен был стать властителем всей Азии. Александр Македонский рассек его мечом. Отсюда и возникло выражение «гордиев узел», означающее всякое запутанное сплетение обстоятельств; «разрубить гордиев узел»— разрешить какое-либо сложное, запутанное дело, затруднение насильственным, прямолинейным способом.

**ПАПРАЎКА**

У мінулым нумары нашай газеты, за 20 лютага, у матэрыяле «Гаспадары ці кватаранты?» дапушчана недакладнасць. У другой калонцы сёмы радок зверху трэба чытаць так: «І у 120 пакоі зноў нечаканасць!».

# ЦІКАВАЕ Ў БІЯГРАФІЯХ

Выдатны шахматыст Аляксандр Аляксандравіч Алёхін (1892—1946 гг.) меу здзіуляюча вострую памяць і у маладосці скардзіуся на гэта, маючы на увазе, што ён запамінае многае насуперак свайму жаданню і волі.

Аднойчы у прафесара П. Цітовіча, дзе быу Алёхін, нехта прапанавау праверыць чуткі аб незвычайнай яго памяці. Гаспадар узяу кнігу і, раскрыушы яе, перадау Алёхіну, які мінуты тры—чатыры глядзеу у тэкст, а пасля, вярнуушы кнігу гаспадару, упэунена і хутка аднавіу гучным шэптам тэкст у паутары старонкі, не дапусціушы ніводнай памылкі.

Персідскі цар Кір ведаў па імёнах усіх салдат сваёй арміі, а грэчаскі дзяржауны дзеяч Фемістокл — кожнага з 2.000 жыхароу Афін.

Кампазітар А. П. Барадзін вядомы як выдатны вучоны-хімік, ён бліскуча абараніу доктарскую дысертацыю, яму належыць звыш сарака даследаванняу па пытаннях хіміі.

Л. М. Талстой у 70-гадовым узросце спаборнічау у канькабежным спорце з моладдзю, якая гасціла у Яснай Паляне, і дабіваўся поспеху.

У 1896 годзе, калі Талстому было звыш 60 год, ён прайшоу за 6 дзён 200 кіламетрау ад Масквы да Тулы, а пасля адправіуся пешшу з Яснай Паляны у Калугу.

Вам вядома імя М. М. Бацвінніка — гросмайстра і неаднаразовага чэмпіёна свету па шахматах, але далека не кожны ведае, які вялікі уклад Бацвінніка-інжынера у развіцці савецкай энергетыкі.

Міхаіл Майсеевіч тэарэтычна і эксперыментальна даказау магчымасць значна павялічыць устойлівасць сінхронных машын, стварыу новую арыгінальную канструкцыю рэгулятара узбуджэння. За працы у гэтай галіне Бацвінніку прысуджаны вучоныя ступені: у 1937 годзе—кандыдата тэхнічных навук, а у 1952 годзе—доктара тэхнічных навук.

# ФІНІШАВАЛІ СКАРАСНІКІ

Закончылася першынство універсітэта па скарасному бегу на каньках. Па-за конкурсам у ім прынялі удзел спартсмены інстытута фізкультуры, народнай гаспадаркі і тэхналагічнага. Лепшыя вынікі былі паказаны прадстаунікамі ІФК.

Чэмпіёнамі універсітэта, як і трэба было чакаць, сталі Ніна Матусевіч (4 курс матфака) і Барыс Гігевіч (5 курс геафака). Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: I — геафак, II — хімфак, III — філфак, IV — матфак, V — фізфак, VI — юрфак, VII — журфак. Гістарычны і біялагічны факультэты каманд не выставілі.

**О. АЛЕКСАНДРОВІЧ,**
сакратар спаборніцтвау.



ІНЕЙ. Фотаэцюд **А. Цянскага.**

Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

АТ 22018. Зак. 298. **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз.**